# Пагас алімпійскі агонь

## Гульні-2016 завяршыліся ў Бразіліі

**Маляўнічая цырымонія закрыцця адбылася на легендарным стадыёне «Маракана». Святочнага карнавальнага настрою не сапсаваў нават праліўны дождж, які суправаджаў мерапрыемства.**

Мінулі два тыдні напружанай спартыўнай барацьбы тысяч атлетаў, і вось у нядзельны вечар спартсмены і трэнеры маглі выдыхнуць і расслабіцца — усе медалі ўжо раздадзеныя. На цырымоніі закрыцця прысутнічалі каля 80 тысяч чалавек. Спачатку ўсе ўдзельнікі Гульняў прайшлі шэсцем (сцяганосцам нашай зборнай быў Іван Ціхан, сярэбраны прызёр Алімпіяды-2016), а затым пачалося маляўнічае шоу. Сцэна на стадыёне «Маракана» расцвіла дзіўнымі кветкамі, з якіх склаліся спачатку галоўныя славутасці Рыа-дэ-Жанэйра, уключаючы гару Каркавада, увянчаную статуяй Хрыста, а затым алімпійскія кольцы. Цырымонія закрыцця, як і мае быць у Бразіліі, была падобная да бясконцага карнавалу, прычым не толькі на сцэне, але і за кулісамі.

У завяршэнні на стадыёне пагасілі алімпійскі агонь, які гарэў на працягу ўсіх 16 дзён спаборніцтваў, а сцяг Міжнароднага алімпійскага камітэта быў афіцыйна перададзены Токіа, дзе пройдуць наступныя Алімпійскія гульні 2020 года.





### Апошні акорд

У заключныя дні Алімпіяды нашы атлеты дабавілі ў скарбонку зборнай яшчэ тры ўзнагароды. Сярэбраным прызёрам стаў вопытны беларускі **легкаатлет Іван ЦІХАН**. У сваёй найлепшай спробе ён паслаў молат на 77 м 79 см. Перасягнуць Івана змог толькі Дылшад Назараў з Таджыкістана, вынік чэмпіёна — 78 м 68 см.

*— Сярэбраны медаль Рыа ў мяне, можна сказаць, з залатым адлівам. Заўзятары, якія ўважліва сачылі за маёй гісторыяй з адлучэннем ад удзелу ў турнірах, выдатна разумеюць, чаму я даў такую ацэнку сваім выступленню. Пройдзены вялікі шлях. Пасля Пекіна ў 2008 годзе, здавалася, я ўжо шмат чаго дамогся, але памыляўся. Даволі пачынаць сваю кар'еру наноў, — сказаў Ціхан. — У апошняй спробе шукаў у сабе сілы і магчымасці пераадолець адзнаку ў 80 м. Усё ж такі гэта гросмайстэрскія лічбы сярод кідальнікаў. Я змагаўся да канца, хацелася паказаць больш высокі вынік, — дадаў Іван.*

Беларускі экіпаж байдаркі-чацвёркі заваяваў «бронзу» алімпійскай рэгаты. У фінальным заездзе на дыстанцыі 500 м Маргарыта Махнева, Надзея Ляпешка, Вольга Худзенка і Марына Літвінчук паказалі вынік 1 хв. 36,908 сек.

*— Для мяне гэты медаль вельмі каштоўны, таму што ён алімпійскі,* — адзначыла кармавая **вяслярка Маргарыта Махнева.** *— Хоць, што душой крывіць, усе дзяўчаты настройваліся на перамогу. Але паколькі алімпійская ўзнагарода ў мяне першая, то я бязмерна шчаслівая. Упэўнена, што і ў маіх напарніц такое ж меркаванне.*

Нагадаем, да гэтага поспеху беларускія весляры на алімпійскім канале «Лагуна» не заваявалі ніводнай узнагароды.

Барэц вольнага стылю Ібрагім Саідаў стаў бронзавым прызёрам у вагавой катэгорыі да 125 кг. Адзначым, што ўпершыню з 1996 года прадстаўнікі Беларусі на Алімпійскіх гульнях заваявалі тры ўзнагароды ў барцоўскім турніры. У Рыа акрамя Ібрагіма Саідава медалістамі таксама сталі барэц грэка-рымскага стылю Джавід Гамзатаў, які выйграў «бронзу» ў вагавой катэгорыі да 85 кг, і Марыя Мамашук, на рахунку якой «серабро» ў спаборніцтвах жанчын у вагавой катэгорыі да 63 кг.

На жаль, упершыню за доўгія гады па-за п'едэсталам засталіся беларускія грацыі. Галоўная надзея нашай каманды Меліціна Станюта заняла толькі 5-е месца, другі нумар зборнай, Кацярына Галкіна, размясцілася на 6-й выніковай пазіцыі. Не змаглі заваяваць медалі беларускія дзяўчаты і ў групавым практыкаванні (5-е месца).

Яшчэ адна прэтэндэнтка на ўзнагароды Марына Арзамасава не здолела дацягнуцца да п'едэстала, у фінальным забегу на 800 м яна была толькі 7-й.

У выніку беларуская зборная заняла 40-е месца ў агульным медальным заліку, на рахунку нашых спартсменаў 9 алімпійскіх узнагарод.

### Трыумф гаспадароў

У апошнія дні Алімпіяды завяршыліся спаборніцтвы ў гульнявых алімпійскіх турнірах. Мужчынская зборная Бразіліі па валейболе і футболе заваявалі алімпійскія тытулы. Найлепшымі ў гандбольным турніры ўпершыню сталі датчане, якія ў фінальным паядынку абгулялі зборную Францыі. Алімпійскім чэмпіёнам па баскетболе стала зборная ЗША.

Жаночая каманда Расіі ў гандболе выйграла алімпійскі турнір у Бразіліі, у фінале расіянкі былі мацнейшымі за француржанак. Наймацнейшымі сярод баскетбалістак сталі спартсменкі з ЗША, у валейбольным турніры перамагла зборная Кітая.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.04 | 20.18 | 14.14 |
| Віцебск — | 5.51 | 20.11 | 14.20 |
| Магілёў — | 5.54 | 20.08 | 14.14 |
| Гомель — | 5.55 | 20.01 | 14.06 |
| Гродна — | 6.20 | 20.33 | 14.13 |
| Брэст — | 6.24 | 20.30 | 14.06 |

### Месяц

*Поўня 18.08—24.08.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.*** *Вячаслава, Лаўрэнція, Рамана.*
***К.*** *Валерыі, Ружы, Валяр'яна, Віктара, Філіпа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 23 ЖНІЎНЯ

**1801** год — 215 гадоў таму нарадзіўся Юльян Міцкевіч, гісторык права. Брат Адама Міцкевіча. Скончыў дамініканскую школу ў Навагрудку, Віленскі універсітэт. Напісаў «Энцыклапедыю права» і «Курс рымскага права» (захаваліся ў рукапісах). Памёр у 1871 годзе.

**1901** год — нарадзіўся (г. Ігумен, цяпер — Чэрвень) Давыд Голуб, вучоны ў галіне нармальнай анатоміі, заслужаны дзеяч навукі, акадэмік. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку 9 манаграфій. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за даследаванні развіцця і будовы вегетатыўнай нервовай сістэмы і стварэнне новых нервовых шляхоў унутраных органаў.

**1917** год — нарадзіўся Пімен Панчанка, народны паэт Беларусі, ганаровы член НАН. Аўтар паэтычных зборнікаў «Дарога вайны», «Чатыры кантыненты», «Пры святле маланак» і інш. Шырока выкарыстоўваў фальклорныя вобразы і прыёмы. Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы Ф. Шылера, А. Міцкевіча, Я. Райніса. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1981). Памёр у 1995 годзе.



**1939** год — падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзе (пакт Молатава-Рыбентропа). Згодна з дамовай, бакі абавязаліся ўсе спрэчкі і канфлікты паміж сабой «вырашаць выключна мірным шляхам у парадку сяброўскага абмену думкамі». У другім артыкуле дагавора гаварылася, што «ў выпадку, калі адзін з бакоў акажацца аб'ектам ваенных дзеянняў з боку трэцяй дзяржавы, другі дагаворны бок не будзе падтрымліваць ні ў якой форме гэтую дзяржаву». Іншымі словамі, СССР не будзе дапамагаць магчымым ахвярам агрэсіі фашысцкага рэйха. Дагавор меў «сакрэтны дадатковы пратакол» аб размежаванні «сфер уплыву» ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе. Прадугледжвалася, што ў выпадку вайны Германіі з Польшчай нямецкія войскі могуць прасунуцца да так званай «лініі Керзана»; астатняя частка Польшчы, а таксама Фінляндыя, Эстонія, Латвія і Бесарабія прызнаваліся «сферай уплыву» СССР. Дагавор быў ратыфікаваны Вярхоўным Саветам СССР праз тыдзень пасля яго падпісання, прычым ад дэпутатаў была ўтоена наяўнасць «сакрэтнага дадатковага пратакола».

**1943** год — Чырвоная армія разграміла нямецка-фашысцкія войскі ў бітве на Курскай дузе, адкінуўшы праціўніка на 140—150 кіламетраў на захад і вызваліўшы Арол, Белгарад, Харкаў. Курская бітва, якая доўжылася 49 дзён, замацавала карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны, пачатак якому быў пакладзены разгромам нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам. Завяршэннем яго стала фарсіраванне Дняпра і вызваленне Кіева.

### Было сказана

**Сяргей ДЗЯРГАЙ, паэт:**

*«І, можа, ісціна у гэтым.*
*І мэта — ў вечнай барацьбе*
*Твайго маленечкага свету*
*З тым, што не змесціш у сабе?»*

## УСМІХНЕМСЯ

**Бачу дзяўчыну ў рваных джынсах — разумею, што яна добрая гаспадыня, умее эканоміць на сабе. Такая футра гадоў 15 будзе насіць.**

— Мужчына, дапамажыце рэчы перавезці.
— Куды?
— Да вас!

**— Доктар, а што такое «традыцыйны наркоз»?**

**— А вось гэта, хворы, вам ведаць не трэба — дапівайце сваю гарэлку, вось вам яшчэ куфель піва і лезьце на аперацыйны стол...**

Маці вымаўляе настаўніку свайго сына:

— Ну як вы маглі даць майму сыну задачу, у якой бутэлька піва каштавала 37 капеек?! Мой муж ад настальгіі ўсю ноч не мог вачэй заплюшчыць!




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3309.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12